# МЕДАЛЬЕРНАЕ МАСТАЦТВА ВАЛЕРЫЯ МАГУЧАГА ЯК ПРЫКЛАД СПАЛУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

***Калясінскі Валерый Францавіч****,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*

***Анатацыя****. Медальернае мастацтва развіваецца ва ўзаемасувязі са ўсімі відамі выяўленчага мастацтва. Дзякуючы гэтаму, медальернаму мастацтву характэрны тэндэнцыі і праблемы, якія датычыцца ўсіх відаў выяўленчага мастацтва. Медальерным мастацтвам займаюцца жывапісцы, графікі, архітэктары, скульптуры, мастакі дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва. Можна зрабіць высноўу, што мастацтвам медалю валодаюць універсальныя мастакі. Сярод мастакоў, якія эпізадычна займаюцца медальерным мастацтвам, вылучаюцца майстры, з імёнамі якіх звязаны дасягненні ў гэтым выглядзе выяўленчага мастацтва. Да такіх медальераў належыць Валерый Магучы, заўсёды гатовы да творчых эксперыментаў для пошуку новых сродкаў выразнасці. В. Магучы сваей творчасцю аказвае ўплыў на сучаснае развіццё медальернага мастацтва Беларусі. Яго творчасць звязана з нацыянальнымі традыцыямі. Шэраг медаляў не падыходзіць пад агульнапрынятае ўяўленне аб медальерным мастацтве.*

Медальернае мастацтва развіваецца ў узаемасувязі і часта на мяжы з іншымі відамі мастацтваў ва ўмовах глабалізацыі, крызісаў, удала спалучаючы традыцыі і навацыі. Абагульненне вобраза да алошняй ступені, як у манументальным мастацтве, прапрацоўка дэталяў як у скульптуры малых форм ці ювелірных творах падуладны медальернаму мастацтву. Пейзаж, нацюрморт, якія традыцыйна лічыліся сферай жывапісу, графікі знайшлі сваё месца на медалях. Фальклорныя матывы і народныя сімвалы ўзяты з дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Невычарпальны арсенал выяўленчых сродкаў выкарыстоўваецца сучаснымі мастакамі ў медальерным мастацтве.

Медальераў спецыяльна не рыхтуюць у вучэбных установах, але праграма навучання ўключае і заданне на медалях ці плакетках, таму скульптары, мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва часцей займаюцца медальерным мастацтвам. Спрабуюць свае сілы і жывапісцы, графікі, архітэктары. Сярод іх ёсць творцы, якія дасягнулі поспехаў у гэтым відзе скульптуры.

Валерый Магучы знаходзіцца ў шэрагу вядучых майстроў-медальераў Беларусі. Трэба адзначыць, што ўсе медалі В. Магучага аднабаковаыя, што гаворыць аб іх прызначэнні экспанавацца на выставах. Адваротны бок аўтар не распрацоўвае. Так экспануюцца манументальны і станкавы рэльеф. Медалі В. Магучага аўтарскія накладам адзін-два экзэмпляры. Мастак адчувае медаль і робіць працы для сябе, на выставы не клапоцячыся аб атрыманні заказа. Жаданне як мага больш раскрыць тэму падштурхоўвае да эксперыментаў з рознымі матэрыяламі, таму адна і тая медаль можа быць выканана ў такіх матэрыялах як гіпс



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таніраваны, бронза, латунь, алюміній. В. Магучы распрацоўвае ў медалях традыцыйныя тэмы і эксперыментальныя. Да традыцыйных па зместу тэм адносяцца звяртанне да вобразаў славутых дзеячоў бацькаўшчыны. Эксперыментальнае мастацтва звязана найперш да звяртання да авангарднага мастацтва. Станкавы і манументальны партрэт аказвае ўплыў на партрэтныя медалі В. Магучага. Заўважана, калі мастак без вопыта працы ў станкавым ці манументальным партрэце спрабуе зрабіць партрэтную медаль, то як правіла мастацкія якасці гэтага твора назначныя. У асноўным гэта датычыцца дызайнераў і мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Працуючы ў такім кансерватыўным жанры як партрэтная медаль В. Магучы знаходзіць новыя пластычныя вырашэнні. Напрыклад, на медалі «Ю. М. Пэн. 1854-1937» (1992; алюміній; д. 150 мм), прысвечанай вядомаму віцебскаму мастаку, майстр дакладна перадае аўтапартрэт мастака. Дыптых «Прысвячэнне творчасці М. Шагала» вырашаны ў авангардных традыцыях. На першым медалі «Тебя я в песнях воспевал, Витебск» (1994; гіпс таніраваны; 130х120 мм) стылізаваны партрэт М. Шагала лунае над забудовай старога Віцебска. На другім медалі «Віцебск» (1994; гіпс таніраваны; 120х115 мм) стылізаваная галава М. Шагала схілілася над куточкам старога горада. Гэтыя медалі не маюць традыцыйнай круглай формы. Выявы ў авангардных традыцыях дыктуюць складаны сілуэт па краю медаля, паўтараючы контур галавы, архітэктурных выяў, ствараючы ламаны сілуэт.

У акадэмічных традыцыях выкананы партрэт М. Шагала, прадстаўлены на медалі «Марк Шагал» (1990; латунь; 240х235 мм). Сілуэт медаля мае недасканалую форму. На медалі М. Шагал выяўлены ў профіль чалавекам ва ўзросце, які смяецца таму, што ўспрымае жыццё лраз радасць, смех.

Для медаля «Henri Matisse» (1990; алюміній; д. 170 мм) знойдзена арыгінальнае вырашэнне, якое адпавядае творчаму метаду французскага мастака. Г. Маціс бездакорна валодаў лініяй і прасторавым маляваннем, таму партрэт Г. Маціса на медалі перададзены лініяй. Вельмі лаканічнымі сродкамі ствараецца пазнавальны вобраз вялікага французскага мастака.

Спасцігаючы Ван Гога В. Магучы знаходзіць новыя сродкі выразнасці, якія дапамагаюць больш ёмка стварыць вобраз. Поле медаля «Ван Гог» (1990; алюміній; 185х170 мм) нагадвае сланечнік, у сярэдзіне якога стаіць спіной мастак з мальбертам. Сланечнік падобны на пякучае сонца ці згусткі энергіі, якія ідуць ад мастака. Медаль вельмі змястоўны і лаканічны, як знак. Можна смела назваць гэты медаль адным з лепшых у творчасці В. Магучага.

На медапі «Драздовіч» (1992; гіпс таніраваны; 180х170 мм), які прысвечаны Язэлу Драздовічу, вобраз мастака нагадвае бога — стваральніка сусвету сярод касмічных аб'ектаў. Тэта I не дзіва, таму што Я. Драздовіч пачынальнік касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым

мастацтве і аўтар шэрагу навукова-папулярных прац, дзе ён дае сваё тлумачэнне касмічным з'явам. Медаль мае звыкла складаны сілуэт, які мадэліруе касмічную прастору.

На медалі «Матусевіч Уладзімір Баляслававіч. 1941-1994» (1994; гіпс таніраваны; Д. 165 мм) партрэт расійскага графіка зроблены з характэрнымі рэзанымі штрыхамі, якія застаюцца ў лінагравюры.

Філасофскі сэнс закладзены ў кампазіцыі «Рэрых» (1989; алюміній; 230х200 мм). Справа ад партрэта Мікалая Рэрыха поле медаля, якое сівалізуе матэрыю, а злева пустата. Чалавек бачыць сусвет трэцім вокам на мяжы матэрыі і пустаты.

На медалі «І. Рэпін» (1994; гіпс таніраваны; д. 150 мм) адлюстраваны поўны жыцця і энергіі творца.

Медалі, прысвечаныя пісьменнікам, розныя па выкананню. Калі ў такіх медалях як «Янка Купала. 1992» (1992; бронза; д. 145 мм), «Якуб Колас. 1992» (1992; гіпс таніраваны; д. 150 мм), прысвечаных М. Багдановічу медалях «Паглядзі, як усход разгараецца» (1992; гіпс таніраваны; д. 150 мм), «В. Цяпінскі. 450» (1990; сілумін; 160х155 мм) ставіцца за асноўную мэту дакладнасці перадачы падабенства, то ў медалі «С. Палуян. 1890-1910» (1990; бронза; д. 180х160 мм) больш складаная трактоўка. Трагічнасць лесу падкрэслена расчэплінай, а надпіс «палуян» нагадвае вяроўку.

Медаль «Вярыга-Дарэўскі» (1992; бронза; д. 180х180 мм), прысвечаная беларускаму пісьменніку, якога царскія ўлады за ўдзел у паўстанні 1863 года адправілі ў Сібір, выяўлена з цэпам, які разрываецца, як і было разарвана яго жыццё.

Еўфрасіння Полацкая на медалі «Еўфрасіння Полацкая» (1992; алюміній; д. 195х185 мм) знаходзіцца ў вянку з кніг, дзе знайшлі сваё месца і яе творы.

На медалі «Платонов» (1994; гіпс таніраваны; д. 200х195 мм), прысвечаным расійскаму пісьменніку А. Платонаву, партрэт зліваецца з фонам, які сімвалізуе глебу. Пластыннымі сродкамі перададзена злучанасць пісьменніка з зямлёй.

На медалі «В. Хлебнікаў» (1990; алюміній; д.155х145 мм) аўтапартрэт пісьменніка ўзаемадзейнічае з полем медаля, сімвалізуе момант зліцця з наваколлем, калі ўсё пераходзіць адзін у адно.

В. Магучы стварыў плакетку «Вітаўт. 1350-1430» (1991; гіпс таніраваны; д. 240х180 мм). Скульптар паставіў за мэту дакладна перадаць выяву дзяржаўнага дзеяча паводле гравюры з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваніні 1581 г.

Людзі творчых прафесій прывабліваюць В. Магучага і даюць яму імпульсы для пластычных знаходак. У медалі пад аўтарскай назвай «Люсі» (2001; гіпс; д. 170 мм) вобраз танцоўшчыцы і харэографа трактуецца праз доўгую шэю і рукі, якія перадаюць рух танца.

Характэрная медаль «Кампазіцыя» (1994; латунь; д. 165 мм) сведчыць аб авангардных пошуках майстра. Але фармальныя пошукі не сталі галоўнымі ў творчасці мастака. Галоўнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месца ў медальерным мастацтве В. Магучага займаюць выявы «духоўных бацькоў нацыі», вядомых людзей Беларусі, творы, якія нясуць разважанні аб жыцці чалавека І філасофскае бачанне свету. Такія яго медалі аздабляюць старонкі выданняў [1, с. 1. іл.]

Агульна-чалавечыя тэмы закранае В. Магучы ў медалях, прысвечаных узаемаадносінам чалавека з акаляючым асяроддзем. Медаль «Адзіноцтва» (1990; латунь; д. 150x160 мм) закранае праблему адзіноцтва чалавека, дрэва, лісця, якое нясе вецер. Адчуваецца сум, але ўзнікаюць аптымістычныя думкі наконт тага, што усё ў прыродзе заканамерна І прыйдзе час, калі расквітнее і зменіцца ў лепшы бок жыццё чалавека. Кампазіцыі на тэму «адзіноцтва» сімвалізуе кляновы ліст, які выходзіць за плоскасць медаля.

Да гэтай тэмы блізкі медаль, які аўтар назваў «Нікога няма вечнага над маладзікам» (1990; алюміній; д. 180 мм). У цэнтры гэтага медаля размешчаны двое старых, якія павольна ідуць углыб медаля. Уверсе свецііцца маладзік.

Медаль «Лёс» (1990; гіпс таніраваны; д. 155 мм) выяўляе чалавека на стуле, які глядзіць на небасхіл, дзе пралятае зорка. Чалавек вечнасцю аголены, а пралятаючая зорка нагадвае мімалетнасць жыцця.

На медалі пад назвай «Новае-старое» (1989; гіпс таніраваны; д. 220x210 мм) у цэнтры выява навабудоўлі з аднастайнымі дамамі-каробкамі і як кантраст на краю медаля засталіся выдатныя віцебскія помнікі архітэктуры, прывабныя дворыкі. Становіцца жахліва за лёс старога горада, які неабаронены перад навабудоўлямі.

Тэма навакольнага асяродцзя распрацоўваецца ў медалі, якую аўтар назваў «Наша жыццё» (1990; алюміній; д. 165 мм). Двое дачнікаў апынуліся заціснутымі на абмежаваным кавалке зямлі, які абступілі набудовы.

Тэму вышэйшага разуму, які ўсё бычыць, В. Магучы вырашае ў медалі пад аўтарскай назвай «Трэцяе вока» (1992; алюміній; д. 165 мм). На чалавека з далёкай планеты сочыць вока. Такіх планет у космасе мноства і мы не адзінокі.

Трыпціх пад назвай «Метамарфозы» (1990; алюміній; д. 110x100, 100x110 мм) распавядае пра бясконцае нараджэнне жыцця, падпарадкаванасць узроставым зменам. На першай медалі торс маладой жанчыны. На другой выява жанчыны, якая сядзіць паміж сонцам і маладзіком. Трэці медаль з торсам цяжарнай жанчыны.

Усё, што хвалюе чалавека, можна перадаць у медальерным мастацтве, якое знайшло сваё акрэсленае месца побач з іншымі відамі мастацтва.

Глыбіня філасофскага абагульнення ў медалях дасягае пазанацыянальнага значэння. Шукаючы новыя сродкі выразнасці, гатовы да творчых эксперыментаў, В. Магучы аказывае ўдзеянне на сучасны стан медальернага мастацтва Беларусі. Яго працы не заўсёды падыходзяць пад агульнапрынятае ўяўленне аб медальерным мастацтве. Мастак гатовы ўздымаць новыя тэмы. Яго творчасць сведчыць аб сувязях з нацыянальнымі традыцыямі. На

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанне «Што такое скульптура?» В. Магучы адказаў: «Скульптура — тэта маё жыццё, тое, што больш за ўсё хвалюе ў гэтым жыцці, аб чым хочацца гаварыць I перадаць людзям».

ЛІТАРАТУРА

1. Народнае слова. — 1994. — 1 лістапада.

Kalyasinsky Valery

THE MEDALLION ART OF VALERY MOGUCHY AS AN EXAMPLE OF THE COMBINATION OF TRADITIONS AND INNOVATIONS

Medallion art develops in close connection with all kinds of the fine arts. Painters, architects, sculptores as well as representatives of the decorative and applied arts are engaged in medallion art. It is possible to draw the conclusion, that they should be all-round artists. The painter Valery Moguchy is always ready to creative experiments in his search for new means of expression. His creativity has influenced the development of contemporary Belarusian medallion art and is tied to the national traditions. A number of medals is beyond the commonly accepted view of medallion art.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ